Для звесткі абітурыентаў 2022!

Для тых, хто не вызначыўся з выбарам прафесіі, яшчэ застаўся час зрабіць свой выбар. Аддзелам унутраных спраў Шчучынскага райвыканкама да 15 красавіка 2022 года ажыццяўляецца прыём заяў на паступленне ва ўстановы адукацыі «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў» і «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў».

На дзённую форму навучання ў Акадэмію МУС Рэспублікі Беларусь, Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў могуць паступаць на конкурснай аснове грамадзяне Рэспублікі Беларусь з ліку грамадзянскай моладзі, якія дасягаюць 17-ці гадовага узросту, але не старэй 25 гадоў, якія маюць агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную ці сярэднюю спецыяльную адукацыя, здольныя па сваіх асабістых, маральных і дзелавых якасцях, стану здароўя выконваць задачы, ускладзеныя на органы ўнутраных спраў.

Абітурыенты здаюць тры ўступных выпрабаванні ў форме цэнтралізаванага тэставання па наступных прадметах: руская ці беларуская мова, замежная мова, грамадазнаўства. Тэрмін навучання 4 гады. Усім кандыдатам на вучобу неабходна будзе прайсці медыцынскі агляд і прафесійны псіхафізіялагічны адбор.

Больш падрабязную інфармацыю вы можаце атрымаць у кадравым падраздзяленні Шчучынскага РАУС па адрасу: г.Шчучын, вул.Чырвонаармейская, д.12, каб.7, тэл.74041, МТС 80336553020.